УДК 94 (476.5):338.48-6:7/8(476.5)

# АХОВА І ВЫКАРЫСТАННЕ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ НЕРУХОМЫХ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У 1991–2001 гг.: ПЛАНАВАННЕ І МЕРАПРЫЕМСТВЫ МЯСЦОВЫХ УЛАД

Андрэйчык Кацярына Віктараўна
старэйшы выкладчык кафедры гісторыі і турызму
ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»;
магістр гістарычных навук
(г. Полацк, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны дзейнасці мясцовых органаў кіравання па планаванні мерапрыемстваў па ахове і выкарыстанні матэрыяльных нерухомых помнікаў гісторыі і культуры ў межах агульнадзяржаўных праграм рэгіянальнага развіцця ў 1991–2001 гг. Актуальнасць тэмы вызначаецца аналізам прыярытэтных накірункаў у справе аднаўлення матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей .*

Інструментам стратэгічнага планавання мерапрыемств у ахоўнай справе з'яўляліся мэтавыя і рэгіянальныя праграмы, ажыццяўленне какторых было накіравана на садзейнічанне умацаванню культурнага патэнцыялу рэгіена, развіццю сацыяльна-эканамічных адносін, у тым ліку вытворчай сферы (рэстаўрацыйныя майстэрні) у ахоўнай справе, эфектыўнаму выкарыстанню помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны. Рэгіянальныя праграмы у ахоўная справе вылучаліся мэтавай накіраванасцю, абмежаваным тэрмінам і выконваліся ў межах агульнадзяржаўнай канцэпцыі рэгіянальнага развіцця.

Рэгіянальныя праграмы фарміраваліся ў адпаведнасці з Рэспубліканскімі праграмамі захавання гістарычнай спадчыны, інвестыцыйнымі праграмамі, фінансавання, рэгіянальнымі праграмамі будаўніцтва, рэканструкцыі і рамонту. Адказнымі за планаванне былі абласныя і гарадскія выканкамы, якія накіроўвалі свае прапановы у Мінкульт, Дзяржэканомплан, камітэты пры Вярхоўным Савеце. Адной з формаў дзейнасці мясцовых уладаў былі рэгенерацыя і уключэнне у гаспадарчую дзейнасць наяўных або патэнцыяльных аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, рэнавацыя тэрыторы, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця населенага пункта або тэрыторыі.

Пачатак 1990-х гг. быў азнаменаваны пабудовай планаў па ўліку і фіксацыі нерухомых каштоўнасцей у межах нацыянальнай і рэгіянальных праграм пасля аварыі на ЧАЭС. У 1993 г. была рапрацавана Нацыянальная праграма па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 1993–1995 гг. і да 2000 г. Напярэдадні Мінкульт распрацоўваў "Праграму захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей у раёнах, якія трапілі пад уздзеянне Чарнобыльскай аварыі" [1, с. 70]. У 1990 г. Гомельскім і Магілеўскім аблвыканкамамі былі зацверджаны "Мерапрыемствы па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны ў населеных пунктах Гомельскай і Магілёўскай абл., якія падлягаюць адсяленню людзей з забруджаных раёнаў і якія знаходзяцца ў зоне пастаяннага кантролю" на 1991–1995 гг. Рэалізацыя пастаўленых мэт не мела плёну, бо фінансаванне праграмы ажыццяўлялася з саюзнага бюджэту, і пасля 1991 г. так і не была рэалізавана. З 1992 г. Дзяржкамчарнобылем выдзяляліся сродкі на захаванне спадчыны ў пацярпелай ад зоне. Інструментам праграмных мерапрыемстваў стала Джяржаўная гісторыка-культурная экспедыцыя па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў раёнах, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. На гэта было выдзелена 2 млн руб. За гэты кошт у 1992 г. па Гомельскай вобл. было зроблена абследаванне стану помнікаў у 10 найбольш пацярпелых раёнах і складзена база дадзеных. Сіламі навукоўцаў на падставе "Збора помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" (1985) было вызначана, што на забруджанай тэрыторыі знаходзілася 1283 помніка гісторыі і 97 архітэктуры. Планавалася рэстаўрацыя і кансервацыя такіх помнікаў архітэктуры як: палацава-паркавы ансамбль ў Нароўлі і ратуша ў Чачэрску, даследванне помнікаў археалогіі. Была прафінансавана работа Гомельскага абласнога археалагічнага цэнтру па абследаванню помнікаў ў Веткаўскім і Добрушскім раёнах і распрацоўцы схем размяшчэння іх зон аховы. Асаблівая увага была надзелена помнікам драўлянага дойлідства. У 1995 г. БелНДІ горадабудаўніцтва сумесна з Белрэстаўрацыяй вывучыў і зафіксаваў аб'екты драўлянай архітэктуры Буда-Кашалёўскага, Добрушскага і Чачэрскага раёнаў [2, с. 2-4]. Актыўны удзел у выяўленні і фіксацыі спадчыны прынялі навукоўцы. Так, у 1986 г. у МДПІ (зараз МДУ імя А.А. Куляшова) была створана археалагічная секцыя абласнога савета Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Разам з абласным краязнаўчым музеем быў сфарміраваны Магілёўскі абласны археалагічны цэнтр [3, с. 3]. Важным дасягненнем стала выданне ў 1998 г. "Збора помнікаў археалогіі чарнобыльскай зоны Магілёўскай вобл.". У яго было уключана 924 помніка. Што тычыцца адселеных вёсак, то адпаведна Дзяржаўнай праграме па пераадоленні наступстваў аварыі на ЧАЭС на 2001-2005 гг. ім увага не надавалася.

У межах горадабудаўнічай палітыкі прымаліся праграмы па комплексным добраупарадкаваннем населеных пунктаў. Так у 1998 г. Саўмінам была прынята "Праграма мер па эстэтызацыі і добраўпарадкаванні забудовы населенных пунктаў Рэспублікі Беларусь" на 1998-2000 гг. За гэты час планавалася правесці рэстаўрацыю і кансервацыю помнікаў архітэктуры і археалогіі, добраупарадкаванне пахаванняў, рэалізаваць праграму "Эстэтызацыя гарадскіх паркаў і сквераў з размяшчэннем скульптуры". У раздзеле праграмы "Удасканаленне гарадскога дызайна" былі прадстаўлены для рэалізацыі праекты "Светавая рэклама" і "Вячэрнее асвятленне". На 1998-1999 гг. была запланавана распрацоўка і ажыццяўленне падпраграмы "Гербы і ўяздныя знакі гарадоў". У 1998-2000 гг. вялася распрацоўка планаў і выкананне рамонца найбольш важных аб'ектаў архітэктуры. Адказнымі за гэта былі аблвыканкамы, мінгарвыканкам, саюзы архітэктараў і мастакоў. Падпраграма, якая тычылася зберажэння помнікаў гісторыі і архітэктуры і мадэрнізацыі гістарычнай забудовы, уключала распрацоўку канцэпцыі рэгенерацыі гістарычнага цэнтра г. Мінска. На 1998 г. было запланавана рэканструкцыя і рэстаўрацыя аб'ектаў Верхнега горада ў Мінску. У 1998-2000 гг. вялася распрацоўка і рэалізацыя абласных і гарадскіх праграм аховы, рэканструкцыі, рэстаўрацыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны. Напрыклад, на 1998-2000 гг. была запланавана падрыхтоўка мерапрыемств па аднаўленні помніка А.С. Пушкіну ў Магілёве, на 1998-1999 гг. – завяршэнне работ па рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры XII ст. – Благавешчанскай царкве у Віцебску, завяршэнне работ па рэстаўрацыі помніка архітэктуры XIX ст. – будынка па вул. Война ў Полацку, на 1998 г. аднаўленне (устаноўка) на ўсіх помніках ахоўных дошак [4].

На рэгіянальным узроўні ажыцяўляліся праграмы прымеркаваныя да святкавання юбілейных дат старажытных гарадоў Рэспублікі Беларусь. Для прыкладу, з нагоды падрыхтоўкі да святкавання 775-годдзя г. Нясвіжа была распрацавана доўгатэрміновая праграма, якая вызначала шырокі дэяпазон накірункаў па намечаных мерапрыемствах, вызначала тэрміны правядзення, адказныя ведамствы. Так, рашэннем Нясвіжскага райвыканкама быў зацверджаны "План асноўных мерапрыемств па эфектыўнаму выкарыстанню гісторыка-культурнай спадчыны г. Нясвіжа на 1997-2000 гг.". У 1997 г. святкаванне 775-годдзя г. Нясвіжа было аб'яднана з Днем беларускага друку і пісьменства. Адказнымі былі прызначаны Мінкульт, Мінскі аблвыканкам і Нясвіжскі райвыканкам. Было запланавана падрыхтаваць і правесці навукова-практычную канферэнцыю аб ролі Нясвіжа ў культурным жыцці Беларусі і Еўропе (Інстытут гісторыі НАН Беларусі, гісторыка-культурны запаведнік "Нясвіж"), правясці экспедыцыйныя работы па пошуку гісторыка-культурных каштоўнасцей у Нясвіжскім, Слуцкім, Карэліцкім, Сталбцоўскім, Навагрудскім, Шчучынскім раёнах, па выяўленню і сістэматызацыі даследвацельскіх матэрыялаў па дварцова-паркаваму комплексу (1997-2000), выявіць і сістэматызаваць матэрыялы па парку "Альба" (1997-2000), на 1997-1998 гг. завяршыць карэктуру праекта рэгенерацыі гістарычнай часткі г. Нявіжа з распрацоўкай ахоўных зон і зон рэгулявання забудовы у гістарычным цэнтры, асобных помнікаў архітэктуры, паркаў, інжынерных камунікацый (Мінархітэктуры, Белспецпраектрэстаўрацыя, Мінкульт), завяршыць работы па карэктуры генеральнага плана г. Нясвіжа з улікам праекта рэгенерацыі і тэрытарыяльнага развіцця, ажыцявіць рэстаўрацыйныя работы будынка плябані – помніка архітэктуры XVI-XVIII ст. (1997 г.), выканаць праектныя і рэстаўрацыйныя работы гандлевых радоў 18 ст. з прыстасаваннем па назначэнні (1997-2000 гг.), выканаць рамонтна-аднаўленчыя работы помніка



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

архітэктуры XVII ст. – ратушы з прыстасаваннем пад патрэбы гісторыка-культурнага запаведніка (1997-1999 гг.) і інш. [4].

З нагоды святкаваня 900-годдзя Пінска ў 1997 г. гарсаветам 15.01.1996 г. была зацверджана "Праграма падрыхтоўкі горада да святкавання 900-годдзя". Адной з састаўляючых частак гэтай Праграмы з'яўлялася "Праграма эстэтызацыі гарадскога асяроддзя і комплекснага архітэктурнага і дэкаратыўна-мастацкага праектавання фрагмента гістарычнага цэнтра г. Пінска – вул. Леніна". У мэтах рэалізацыі намечаных праграм і захавання ўнікальнай гісторыка-культурнай і архітэктурнай спадчыны горада, Пінскім Саветам народных дэпутатаў была запланавана работа на правядзенне комплекснай рэканструкцыі і рэстаўрацыі гісторыка-запаведнай зоны цэнтральнага раёна, на правядзенне археалагічных вышукаў на тэрыторыі археалагічнага запаведніка, праектаванне комплекснай рэканструкцыі пешаходнай зоны вул. Леніна [5].

Такім чынам, нацыянальныя праграмы па планаванні і ажыцяўленні ахоўных мерапрыемств на рэгіянальным узроўні у перыяд з 1991 па 2001 гг. былі засяроджаны на наступных прыярытэтах: зберажэнне гісторыка-культурнай спадчыны пасля аварыі на ЧАЭС; рэгенерацыі гістарычнай забудовы старажытных гарадоў; праграмы па добраупарадкаванні і эстэтызацыі населенных пунктаў; мерапрыемствы з нагоды святкавання юбілейных дат гарадоў. Мерапрыемствы па зберажэнні матэрыяльных нерухомых помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі пацярпелай ад аварыі на ЧАЭС былі рэалізаваны не поўнасцю: па-першае, па прычыне спынення саюзнага фінансавання пасля 1991 г., па-другое, скіраванасцю асноўных сродкаў на выратаванне рухомых помнікаў, па-трэцяе, недастатковай увагай да помнікаў адселеных вёсак. Толькі ў пачатковым стане знаходзілася рэгенерацыя гістарычных цэнтраў старажытных гарадоў, прычынай таму быў доўгі працэс вызначэння ахоўных зон, распрацоўкі праектна-сметнай дакументацыі па аб'ектах, усталяванні ахоўных дошак. Адносна нерухомых помнікаў Нясвіжа аднаўленчыя работы марудзіліся нявызначанасцю карыстальніка ансамбля былога уладання Радзівілаў, а разам з тым і канчатковых планаў па фарміраванні запаведнай зоны, зацягнуўшымся працэсам узгадненняў паміж ведамствамі. Да ліку станоўчых праяў у ахоўнай справе ў гэты перыяд можна аднесці рэалізацыю праграмы, запланаванай Пінскім гарсаветам па рэканструкцыі і рэстаўрацыі гісторыка-запаведнай зоны. Рэалізацыя ахоўных мерапрыемств мясцовымі уладамі у межах горадабудаўнічай палітыкі спрыяла эстэтызацыі і добраўпарадкаванню неселеных пунктаў, стымуляванню падрымання іх у належным стане, светлавое аздабленне садзейнічала акцэнтуацыі увагі на асобныя помнікі, комплексы, гістарычную забудову як архітэктурныя дамінанты, папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны і інш.


### Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Філістовіч, М. М. Спадчына чарнобыльскай зоны: праблемы захавання / М. М. Філістовіч // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 4. – С. 69-73.
2. Копытин, В. Ф. Свод памятников археологии чернобыльской зоны Могилевской обл. / В. Ф. Копытин ; науч. ред. Г. В. Штыхов. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 1998. – 241 с.
3. Шматаў, В. Спадчына, якую трэба ратаваць / В. Шматаў // Беларус. гіст. часоп. – 1997. – №3. – С. 3-12.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 7, Воп. 12, Спр. 2257.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 7, Воп. 12, Спр. 2259.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова